З пункту гледжання прасторавай арганізацыі абрадаў сустрэчы і выкупу цікавасць уяўляе менавіта рух жаніха з перыферыі локусу маладой (ад варот) праз сістэму граніц (вароты, сені, парог, стол) да яго цэнтра (у дадзеным выпадку застольнай прасторы у чырвоным куце), дзе знаходзіцца маладая. Пераадоленне граніц звязана з выкананнем шматлікіх рытуальных дзеянняў ахвяравальнага і ініцыяцыйнага характару. Усё гэта дазваляе выявіць міфалагічны падтэкст вясельнага рытуалу, які знайшоў таксама ўвасабленне і ў чарадзейных казках, дзе шлях жаніха-героя да нявесты звязаны са шматлікімі выпрабаваннямі і небяспечнымі сітуацыямі. Сімвалічныя выкупы, што суправаджаюць амаль кожны з этапаў абрадавага перамяшчэння маладога, накіраваны на зблізжэнне двух вясельных «родаў», усталяванне новых адносін паміж імі [8, с. 29].

Некаторым лакальным традыцыям уласцівы некалькі іншы сцэнарый прыезду маладога ў дом нявесты. Паводле яго, нявеста не чакае жаніха за сталом, яна ўвогуле адсутнічае (хаваецца). У такім выпадку жаніх павінен яе адшукаць /пазнаць сярод сяброўак. У асобных апісаннях падкрэсліваецца менавіта пазнаванне (калі маладую разам з сяброўкамі накрывалі палатном, або тушылі святло, і жаніх павінен быў беспамылкова знайсці яе) [10, с. 218]. Менавіта матыў раскрывання /пазнавання нявесты ў дадзеным выпадку суадносіцца з ідэяй пераадолення проціпастаўлення «свой»-«чужы».

Такім чынам, у абрадах сустрэчы жаніха і выкупу нявесты прасторавы элемент адыгрывае надзвычай важную ролю, паколькі адлюстроўвае і падкрэслівае абарадвае супрацьпастаўленне і суперніцтва паміж прадстаўнікамі двух «родаў», якое можа быць ахарактарызавана як актуалізацыя апазіцыі «свой-чужы». Пры гэтым па меры разгортвання абраду адбываецца перамяшчэнне вясельнай групы жаніха з перыферыі локусу нявесты да яго цэнтру. Гэтае перамяшчэнне суправаджаецца паступовым зняццем дадзенага супрацьпастаўлення, «асваеннем» жаніха ў локусе нявесты.

**Спіс літаратуры:**


1. Беларускае вяселле: Абрад. Зычэнні. Тосты. Прыказкі. Фразеалагізмы : на матэрыяле Гродзеншчыны / М.А. Даніловіч, Н.К. Памецька, І.В. Піваварчык. – Гродна, 2000. – 131 с.
2. Вяселле : абрад / уклад., уступ. арт. і камент. К.А. Цвіркі. – 2-е выд. – Мн. : Беларус. навука, 2004. – 683 с.
3. Левинтон, Г.А. Мужской и женский текст в свадебном обряде / Г.А. Левинтон // Этнические стереотипы мужского и женского поведения. – СПб. : Наука, 1991. – С. 210 – 234.
4. Мішына, В.І. Сімвалічныя аспекты традыцыйнага вясельнага абраду Лепельшчыны (канец XIX – перш. пал. XX стст.) / В.І. Мішына // III Лепельскія чытанні : матэр. навук.-практ. канф., Лепель, 10 кастр. 2008 г. / адказ. за вып. Баранаў У.А., Стэльмах А.У. ; УК "Лепельскі раённы краязнаўчы музей". – Лепель, 2008. – С. 125 – 128.
5. Мішына, В.І. Структура і сімволіка традыцыйнага вясельнага абраду беларусаў цэнтральнага і заходняга Падзвіння ў 1930 – 1950-я гг. (па матэрыялах этнаграфічных экспедыцый ПДУ) / В.І. Мішына // Беларускае Падзвінне: методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку) : зб. матэр. рэсп. навук.-практ. сем., Наваполацк, 20 – 21 ліст. 2008 г. / пад. агул. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2009. – С. 231 – 236.
6. Нравы и обычаи, народные праздники, местные поверья и предрассудки // Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Смоленская губерния / сост. генерал штаба штабс-капитан М. Цебриков. – СПб. : Тип. департамента Генштаба, 1862. – С. 258 – 316.
7. Пилипенко, М.Ф. Принципы классификации свадебной обрядности белоруссов / М.Ф. Пилипенко // Славяне и их соседи. – Мн. : Веды, 1998. – С. 111 – 115.
8. Піліпенка, М.Ф. Паходжанне і сутнасць сімвалічных выкупаў у беларускай вясельнай абраднасці / М.Ф. Піліпенка // Веснік БДУ, сер. III. – 1969. – № 3. – С. 27 – 31.
9. Романов, Е.Р. Белорусский сборник : в 9 вып. / Е.Р. Романов. – Вильна, 1912. – 600 с. – (Вып. 8 : Быт белоруса. 1886–1912).
10. Романов, Е.Р. Материалы по этнографии Гродненской губернии : в 2 вып. / Е.Р. Романов. – Вильна, 1911. – 238 с. – (Вып. 1 : 1911–1912).
11. Федароўскі, М. Люд Беларускі. Вяселле / М. Федароўскі ; уклад., прадм. і пер. з польск. мовы І.У. Саламевіча. – Мн. : Полымя, 1991. – 142 с.



*Любоў Сівурава*


## МЕТЭАРАЛАГІЧНЫЯ ПРЫКМЕТЫ Ў ЖЫВЁЛАГАДОЎЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

Вялікае значэнне ў жывёлагадоўчай дзейнасці беларусаў мелі метэаралагічныя прыкметы. Добрым «барометрам» селяніна служылі стан і паводзіны свойскай жывёлы. Калі каровы збіраюцца да кучы, мала п'юць вады, а днём спяць, увечары перад навальніцай хаваюцца пад дах, то гэтыя паводзіны з'яўляюцца прыкметамі дажджу. Перад дажджом быкі і каровы падымаюць пысы дагары і ўдыхаюць вільготнае паветра. Конь, прадчуваючы непагадзь, хрыпіць, пырхае. Калі ў каровы поўсць вільготная, то абавязкова будзе дождж. «*Калі карова не дае малако і вельмі махае хвастом, то назаўтра будзе дождж*»; «*Як на дождж, то кароў вечарам не падоіш, такія яны злыя»; «Каровы ўцякаюць з лесу на дождж»* [1, с. 80].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларускія сяляне мелі метэаралагічныя і астранамічныя веды і вельмі часта карысталіся імі ў гаспадарчай дзейнасці. Важнае значэнне на вядзенне сельскагаспадчых работ аказваў месяц. Фазы месяца называліся ў народзе квадрамі. Новы месяц меў назву «*маладзік*», першая квадра – *«падпоўня»*, другая – *«поўня»*. Пасля поўні месяц старэе. Такая фаза ў палешукоў насіла назву «*гнілуха*», «*рушчэнне*», «*гнільца*». Кароткі час бязлуння называўся «*на мяжы*», «*перамена*» [4, с. 187]. Фазы месяцавага календара строга рэгламентавалі тэрміны правядзення гаспадарчых аперацый. Найважнейшыя работы імкнуліся пачынаць пад поўню – адкармліваць парсюка, набываць жывёлу, *«каб усюды было поўна»*, «*купленая ў гэты час жывёла – заўсёды поўная, пражэрлівая і да тлусцення схільная»* [3, с. 406]. Спарванне свіней паміж маладзіком і поўняй магло паўплываць на колькасць прыплоду. Лічылася, што свіння павінна адпарасіцца столькімі прасятамі, колькі дзён прайшло ад маладзіка.

Малады месяц, які ідзе ў рост, спрыяе прыбытку ў гаспадарцы. Падчас маладзіка пачыналі стрыгчы авечак. З ростам месяца ў іх павінна адрастаць добрая густая поўсць. Калі маладзіком лягчаць жывёлу, то хутчэй загаяцца раны. *«Перад поўняю самы лепшы час калоць кабаноў, лягчаць жарабцоў, бычкоў, кабанчыкаў, каб паўнелі»* [1, с. 35]. Купляць жывёлу ў час маладзіка не дазвалялася, лічылі, што яна не будзе ручыцца. У перыяд маладзіка раілася рэзаць свінню, каб сала было белае. Калі рэзаць «старыком», то яно пажаўцее.

У апошнюю квадру месяца рэкамендавалася рабіць розныя ветэрынарныя аперацыі: ускрываць нарывы, ачышчаць гнайнікі, раны, таму што са спадам месяца ўсё павінна пайсці на спад, знікнуць назаўсёды, хутка загоіцца [5, с. 187]. А вось купляць жывёлу і распачынаць іншыя гаспадарчыя справы ў апошнюю квадру месяца не раілася.

Поспех у хатніх справах залежаў таксама ад дня тыдня. Не ў пашане ў беларусаў былі панядзелак і пятніца. Ацёл у гэтыя дні павінен быў адмоўна адбіцца на малочнасці каровы: «*Карова, якая ацялілася ў панядзелак, мала дае малака. А калі яна ацеліцца ў пятніцу, то з яе наогул не будзе ніякай карысці, мала будзе даваць малака»* [1, с. 49]. У пятніцу не дазвалялася мыць і стрыгчы авечак, бо воўна псуецца, мяняецца, мяшаецца волас. Пятніца і нядзеля былі жаночымі днямі, калі асаблівая ўдача чакала пры «*запасванні»* кароў. Лічылася, напрыклад, што ў гэтыя дні на свет з’яўляюцца цялушкі, а не бычкі. Дні тыдня, паводле народных уяўленняў, таксама аказвалі станоўчы або адмоўны ўплыў на вынікі гаспадарчай дзейнасці.

Па паводзінах жывёл прагназавалі надвор’е на наступныя сезоны. Прадчуваючы наступленне зімовых халадоў, жывёлы наядаліся ў запас: *«Калі говядо вельмі шчыра скубе траву, то будзе непагадзь ці хутка выпадзе снег* [1, с. 20]. *«Калі говядо варочаецца з пашы, трымаючы ў пыску траву, то будзе вельмі цяжкая зіма»* [6, с. 150]. Свінні перад наступленнем халадоў уцяпляюць свае «*ляжанкі*», падоўгу цягаюць салому, высцілаюць сабе пасцель. *«Калі ж зімой свінні* (якія знаходзіліся на вольным выпасе. – ***Л.С.***) *далёка адыходзілі ад дому, на лугі і палі, то зімы не трэба было баяцца – яна станавілася мякчэйшая*» [6, с. 158]. У зямлі з восені заставалася шмат клубняў, карэньчыкаў, жалудоў і іншай спажыўнай ежы. Калі снежны наст рабіўся тонкім, падатлівым, то свінні маглі знайсці гэты корм, што быў добрым дадаткам да скупога зімовага рацыёну.

«*Калі падчас зімовага вадапою каровы п’юць вады больш, чым звычайна, то належыць чакаць марозу; калі ж яны ў час марозу трасуць галовамі і «дрыгаюць пры лунцы», то мороз будзе доўжыцца*» [6, с. 150]. Верагодна, падчас вялікага марозу жывёлам холадна стаяць на снезе, а ледзяная вада халодзіць зубы, ад чаго яны пераступаюць з месца на месца і трасуць галовамі. «*Калі ўлетку авечкі, каровы і коні вечарам п’юць больш, чым звычайна, то на наступны дзень трэба чакаць добрага надвор’я*» [6, с. 155]. Як відаць, у жывёлагадоўчай дзейнасці беларусы кіраваліся метэаралагічнымі і астранамічнымі ведамі.

Яны спрыялі атрыманню добрых вынікаў у вядзенні жывёлагадоўчай гаспадаркі. Свойскія жывёлы служылі добрым «барометрам». Тэрміны правядзення гаспадарчых аперацый са свойскай жывёлай рэгламентавалі фазы месяцавага календара. Ветэрынарныя аперацыі стараліся пачынаць пад «поўню». У апошнюю квадру месяца раілася лячыць свойскіх жывёл: ускрываць нарывы, ачышчаць гнайнікі, раны. Лічылася, што са спадам месяца ўсё дрэннае павінна пайсці на спад, знікнуць назаўсёды.

**Спіс літаратуры:**


1. Шумскі, К.А. Традыцыйныя веды беларусаў аб раслінным, жывёльным свеце і надвор’і (XIX — пачатак XXI ст.) і іх экалагічная значнасць / К.А. Шумскі ; навук. рэд. І.П. Корзун. – Мінск : Права і эканоміка, 2009. – 126 с.
2. Берман, И.А. Календарь по народным преданиям в Воложинском приходе Виленской губернии Ошмянского уезда / И.А. Берман // Записки Императ. рус. географ. об-ва. – 1873. – Т. V, Вып. 3. – С. 1–44.
3. Энцыклапедыя сельскага гаспадара. – Мінск : БелЭн, 1993. – 736 с.
4. Общественный, семейный быт и духовная культура населения Полесья / АН БССР, ИИЭФ; АН УССР, Ин-т искусствовед., фольклора и этнографии им. М.Ф. Рыльского (Львовск. отд-ние). – Минск : Наука и техника, 1987. – 375 с.
5. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі : прадм. У.К. Каско; маст. В.Р. Мішчанка. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 301 с.
6. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии / Н.Я. Никифоровский. – СПб., 1895. – 552 с.



***Лілія Гончар***


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ